# РЭЦЭНЗІІ

## СТАНАЎЛЕННЕ ЎКРАІНСКАЙ ДУМКІ

**Рэцэнзія на дылогію А.Л. Багнюка "Українська думка. Імена та ідеї (світоглядні портрети)" – "Княжа доба" и "Козацька доба" (Тернопіль: Астон, 2007)**

Мислитель, вчений будь-якого напряму, духовного чи світського, не може стояти осторонь актуальних проблем свого народу, котрі складають зміст його історії.

Дылогія "Українська думка. Імена та ідеї" даследчыка Анатолія Багнюка з Крамянецкага гуманітарна-педагагічнага інстытута імя Тараса Шаўчэнкі адлюстроўвае наватарскі падыход да выкладу гісторыі ўкраінскай думкі – у форме светапоглядных партрэтаў найбольш значных дзеячаў нацыянальнай гісторыі. У форме "персаніфікаванага" даведніка ўзнаўляецца гісторыя ўкраінскай думкі двух перыядаў – "княжага" і "казацкага". "Княжы" перыяд ахапляе гісторыю грамадска-палітычнай і філасофскай думкі Украіны эпохі сярэднявечча. Перыяд X – XV стст. у гісторыі ўсходнеславянскай думкі, і ўкраінскай у прыватнасці, займае надзвычай важнае месца. У эпоху сярэднявечча, калі філасофія разумелася як усёахопная мудрасць, зарадзілася тэарэтычнае мысленне, складаліся асноўныя паняцці, катэгорыі, што звязана з распаўсюджваннем пісьменнасці ва ўсходніх славян, росквітам духоўнай культуры, эстэтызацыяй разумовай дзейнасці, фарміраваннем своеасаблівай гістарыяграфіі і да т.п. У гэты перыяд фарміраваліся сацыяльная структура феадальнага грамадства, яго дзяржаўнасць, культура, светапогляд, прававыя нормы, літаратурная мова, паўставалі гарады. Духоўная культура гэтага перыяду з'яўляецца агульным здабыткам украінскага, беларускага і рускага народаў. Гэты час звязаў усходніх славян агульнасцю палітычнага, культурнага, рэлігійнага жыцця і адначасова заклаў багатую традыцыю, на аснове якой фарміраваліся, нараўне з самабытнай украінскай, руская і беларуская культуры. Звяртаецца аўтар і да дахрысціянскіх рэлігійных паданняў, міфалогіі перыяду дапісьмовай культуры, па сутнасці – перадгісторыі філасофіі ўсходніх славян.

Філасофія "княжага" перыяду раскрываецца як адмысловы феномен, які мае якасную своеасаблівасць і патрабуе спецыяльнага разгляду. У той час філасофія не вылучылася яшчэ ў самастойную форму ведаў і разумелася як "мудрасць наогул", таму матэрыял даследавання прадстаўлены ў светапоглядных партрэтах палітыкаў, хрысціянскіх асветнікаў, тэолагаў і філосафаў, што дазволіла ўлічыць шырокі спектр жанраў (летапісы, агіяграфіі, павучанні, "словы", аповесці і інш.) і твораў старажытнарускай літаратуры (як агульных для зямель Кіеўскай Русі, так і арыгінальных, створаных на ўкраінскіх землях). Асветлены светапоглядныя пошукі славутых прадстаўнікоў усходнеславянскага сярэднявечча, асаблівае месца сярод якіх займаюць мітрапаліт Іларыён, летапісец Нестар, Клімент Смаляціч, Кірыла Тураўскі і інш. Атрымалі асвятленне такія найважнейшыя асаблівасці філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Кіеўскай Русі, як значная ўдзельная вага анталагічнага і этычнага аналізу, праблем філасофіі гісторыі, гнасеалагічных пытанняў і інш. Разгледжана развіццё гуманістычных ідэй у сацыяльнай і палітычнай этыцы, эстэтыцы і гістарыясофіі. Матэрыялы працы пераконваюць,

Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імені А. А. Куляшова

што X – XV стст. – важны этап станаўлення этнічнай самасвядомасці, паколькі ў гэты час у духоўным жыцці ўкраінскага народа фарміруюцца ідэі патрыятызму, чалавечай вартасці, каштоўнасці гістарычнай спадчыны, славянскага духоўнага яднання і да т.п.

“Казацкі” перыяд ахапляе пераважна гісторыю грамадска-палітычнай і філасофскай думкі Украіны эпохі Адраджэння і ранняга новага часу XVI – XVII стст. Найважнейшым вынікам духоўна-культурнага развіцця грамадства ў эпоху Адраджэння стала станаўленне нацыянальнай самасвядомасці, што адлюстроўвалася ў грамадскай і філасофскай думцы. Мысліцелямі як найбольш значныя абгрунтоўваліся ідэі ўдасканалення чалавека ў кантэксце яго прыналежнасці да хрысціянскай культуры, пэўнай радзімы, народа; грамадзянскага і рэлігійнага міру і згоды; каштоўнасці нацыянальнай духоўнай культуры і мовы. Палітычная сітуацыя з другой паловы XVI ст., Контррэфармацыя і ўвядзенне Брэсцкай царкоўнай уніі (1596) актуалізавалі праблему захавання нацыянальнай ідэнтычнасці, культурна-рэлігійнага суверэнітэту, правоў і свабод украінскага (як і беларускага) этнасаў у складзе Рэчы Паспалітай. Рэлігійна-палітычная супрацьстаянне, якое ахапіла шырокія пласты грамадства, абвастрыла нацыянальна-патрыятычныя пачуцці, спрыяла абуджэнню гістарычнай памяці, грамадзянскай, прававой і канфесійнай самасвядомасці. Якасна змяняецца дзейнасць братэрстваў, а казацкі рух становіцца надзвычай важным фактарам у яднанні ўкраінскага народа за свабоду веравызнання і нацыянальную культуру. Значную ўвагу аўтар дылогіі надае светапоглядным партрэтам удзельнікаў грамадскай і літаратурнай палемікі канца XVI – XVII ст., сярод якіх – Герасім і Мялецій Сматрыцкі, Стэфан Зізаній, Канстанцін Астрожскі, Хрыстафор Філалет, Іпацій Пацей, Іасафат Кунцэвіч, Захар Капысценскі, Фама Іяўлевіч і шматлікія іншыя, творы якіх з’яўляюцца агульным здабыткам украінскай і беларускай літаратур таго часу.

Абапіраючыся на працы папярэднікаў і помнікі айчыннай грамадска-філасофскай думкі, аўтар пашырае ўяўленне аб вытоках, генезісе і спецыфіцы станаўлення нацыянальнай украінскай філасофіі. Праца грунтуецца на новых падыходах у гісторыка-філасофскай метадалогіі, арыентаваная на глыбейшае ўсведамленне канструктыўных асноў і прынцыпаў духоўна-культурнага і сацыяльнага існавання, спецыфікі грамадска-філасофскай творчасці ўкраінскага народа. Матэрыялы дылогіі маюць вялікае практычнае значэнне, могуць шырока выкарыстоўвацца як у навукова-даследчай, так і вучэбна-метадычнай працы, папулярызацыі культурнай спадчыны ўсходніх славян.

Загадчык кафедры філасофіі
УА “МДУ імя А.А. Куляшова”,
кандыдат філасофскіх навук, дацэнт *В.У. СТАРАСЦЕНКА*

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова